**Півавар Кацярына Сяргееўна**
Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны
e-mail: eka15580575@yandex.ru

# ВЕРБАЛІЗАЦЫЯ КАНЦЭПТУ «БЕЛАРУСКІ НАРОД» У ТВОРЧАСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА

***Анатацыя:*** артыкул прысвечаны вывучэнню моўных сродкаў рэпрэзентацыі канцэпту «беларускі народ» на матэрыяле творчасці У. Караткевіча, уключанай у школьную праграму па беларускай літаратуры. Аўтар прыходзіць да высновы, што моўныя сродкі выражэння канцэпту «беларусы» ў творчасці У. Караткевіча шматлікія і разнастайныя. Пісьменнік неаднаразова сцвярджае, што беларускі народ – багаты талентамі, годны, вольналюбівы, велічны народ са слаўнай гісторыяй і шчаслівай будучыняй.

***Ключавыя словы:*** У. Караткевіч, канцэпт «народ», мастацкая канцэптасфера, беларуская літаратура.

**Katsiaryna Pivavar**
Vitebsk State Academy of Veterinary Medicine
e-mail: eka15580575@yandex.ru

# VERBALIZATION OF THE CONCEPT «BELARUSIAN PEOPLE» IN THE WORKS BY U. KARATKEVICH

***Abstract:*** The article is devoted to the study of linguistic means of representation of the concept of «Belarusian people» on the material of U. Karatkevich's work, included in the school curriculum on Belarusian literature. The author concludes that the linguistic means of expression of the concept of «Belarusians» in the works of U. Karatkevich are numerous and diverse. The writer repeatedly claims that the Belarusian people are rich in talents, worthy, free-spirited, majestic people with a glorious history and a happy future.

***Keywords:*** U. Karatkevich, the concept of «people», artistic conceptual sphere, Belarusian literature.

У сучаснай навуцы пра мову актыўна распрацоўваецца лінгвістычная тэорыя канцэптаў. Канцэпты – гэта ментальныя ўтварэнні, якія ўяўляюць сабой значныя фрагменты вопыту, якія захоўваюцца ў памяці і асэнсоўваюцца, тыпізуюцца. Тыпізаванасць гэтых адзінак замацоўвае ўяўленні ў выглядзе розных стэрэатыпаў, іх усвядомленасць дае магчымасць перадаць інфармацыю аб іх іншым людзям, іх значнасць замацоўвае ў індывідуальным і калектыўным вопыце

важныя (і таму яны эмацыянальна перажываюцца) характарыстыкі рэчаіснасці. Гэтыя характарыстыкі прадстаўляюць сабой іх вобразна-перцэптыўны, паняццевы і каштоўнасны бакі.

Актуальнасць нашага даследавання вызначаецца тым, што спецыфіка індывідуальна-аўтарскага разумення канцэпту *беларускі народ* як складанага і шматзначнага паняцця і яго вербальнага выражэння ў мастацкім тэксце да гэтага часу недастаткова распрацаваны ў сучаснай лінгвістыцы. Да таго ж, у 2020-м годзе спаўняецца 90 год з дня нараджэння славутага беларускага пісьменніка Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча, таму крыніцай даследавання паслужылі творы пісьменніка, уключаныя ў школьную праграму па беларускай літаратуры (раманы «Каласы пад сярпом тваім», «Дзікае паляванне караля Стаха», аповесці «Ладдзя роспачы», «Чазенія», нарыс «Зямля пад белымі крыламі», казкі «Нямоглы бацька», «Лебядзіны Скіт», паэтычныя творы).

Мэта працы – выявіць і апісаць лексічныя адзінкі мастацкага тэксту, якія рэпрэзентуюць нацыянальны характар беларусаў у творчасці У. Караткевіча, выявіць асноўныя рысы нацыянальнага характару беларусаў, апісаных пісьменнікам.

Канцэпт *беларусы* у творчасці пісьменніка рэпрэзентуецца праз наступныя моўныя адзінкі: *народ, беларускі народ, беларусы, сыны Радзімы, дочкі, сыны, браты, нашчадкі Каліноўскага, землякі, сцішаны і грозны народ, народ, які ніколі не крыўдзіў другіх, мужны і адвечны народ, сыны герояў і багоў, унукі Скарыны*.

Несумненна, шмат інфармацыі пра беларусаў можна знайсці ў нарысах «Зямля пад белымі крылымі» (вывучаецца ў 7-м класе). Тут знаходзім звесткі як пра знешнасць беларусаў («*рысы аблічча мяккія, склад, здаецца на першы позірк, крыху далікатным»* [2, с. 247]) да рысаў характару – гасціннасць, цягавітасць, вынослівасць, павага да іншых народаў, памяркоўнасць, гумар, самасуцяшэнне [2, с. 244–247].

Як паказвае аналіз творчасці У. Караткевіча, пісьменніку ўласціва ўсведамленне вобраза беларусаў як народа гераічнага, свабодалюбівага, смелага: *Скупая зямля маёй Беларусі / Не раджала рабоў і не мела рабоў* [3, с. 81]; *Дзе мой край? Там, дзе людзі ніколі не будуць рабамі, што за поліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме»* [6, с. 325]. Такім чынам, канцэпт *беларусы* ў моўнай карціне аўтара атаясамліваецца са *свабодай*, ці імкненнем да яе: *Быў просты рахманы і вельмі мужны народ. Добры, верны сябрам і страшны ворагам, вольналюбівы, чысты і горды* [5, с. 329].

У. Караткевіч – не толькі таленавіты пісьменнік, але і гісторык, даследчык беларускага народа. Яго раман «Каласы пад сярпом тваім» утрымлівае шмат пісьменніцкіх разважанняў пра паходжанне, гісторыю, характар беларускай нацыі. Вобразы Алеся Загорскага, К. Каліноўскага, сям'і Кагутоў несумненна з'яўляюцца рамантычна ўзнёслымі вобразамі беларусаў. Акрамя таго, па кантэктсах з рамана можна рэпрэзентаваць аўтарскае уяўленне беларусаў XIX ст.: *Наш народ спявучы,*

*таленавіты, горды. І вось яго ўвесь час дзякуюць за дабрыню седзячы на ягонай спіне* [4, с. 323]. Знаходзім у рамане і мноства назваў беларускага народа: *Ды і хіба не ўсё адно, калі я сам лічу сябе ліцвінам, беларусам, тутэйшым – назавіце як хочаце* [5, с. 317].

Канцэпт *беларусы* мае цесную сувязь з канцэптам *мова*, што пацвярджаецца наступнымі кантэкстамі: *Пакуль гучыць вакол святая наша мова, / Пакуль ёсць беларусы на Зямлі* (час існавання мовы і беларусаў аднолькавы) [3, с. 381]; *Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок, / Тая гордая мова, якую й тады не забудзем, / Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок* [3, с. 136]. Пісьменік даволі катэгарычна выказваецца пра народ, які забудзецца сваёй мовы, а значыць, стане здраднікам Радзімы: *Хай не будзе світання ў народа майго, / Калі досвіткам здрадзіць цябе* [3, с. 364]. Неаднойчы мова выступае сінонімам волі і гонару Радзімы: *За край, даўно адвучаны ад бою, / Ад мовы, гонару і языка* [3, с. 292]; *Край баіцца размовы пра волю, / Край згубіў сваю мову / І матчынай песні напеў* [3, с. 30].

У сваёй творчасці У. Караткевіч указаў і на заганныя рысы беларусаў, сярод якіх выдзеліў – беспамяцтва, прыстасавальніцтва: *Пакуль у капішчах іхніх будзеш паўзці, нібы крот, / Пакуль ты слухаць іх будзеш і пакуль ты верыць ім будзеш, / і пакуль будзеш скарацца ім, мой беларускі народ, / вашага бога не ведаю, з раем рабоў і гаротных* [3, с. 290]. Аднак адзначым, што кантэксты з адмоўнай канатацыяй, якія рэпрэзентуюць канцэпт *беларускі народ*, з’яўляюцца адзінкавымі.

У. Караткевіч прамаўляе свой запавет да беларусаў, які заключаецца ў першую чаргу ў захаванні сваёй гісторыі: *Вазьмі ў звычай, сын герояў і багоў, / Не пагарджаць святым сваім мінулым, / А заслужыць яшчэ , і вартым быць яго* [3, с. 280]; *Абыякавы да мінулага не мае аніякай інтэлектуальнай перавагі над жывёлай, і таму ёсць першы кандыдат на маральную, а затым фізічную смерць. Усё адно хто гэта – чалавек ці народ* [5, с. 127]; *Унукі Скарыны, / Дзе ваш гонар, моц і краса? / Ёсць і ў вас, як у іншых, святыня, / Не давайце святыні псам!* [6, с. 389].

Такім чынам, мастацкі тэкст як аб’ект даследавання канцэптасферы ўтрымлівае ў сабе ўніверсальны вопыт асобы, яе светапогляд, сістэму каштоўнасцей. Разгледжаны намі матэрыял дазваляе сцвярджаць, што моўныя сродкі выражэння канцэпта *беларусы* ў творчасці У. Караткевіча шматлікія і разнастайныя. Гэта дапамагае змадэляваць дадзенае лінгваментальнае ўтварэнне ў канцэптасферы пісьменніка, дзе яно мае цесныя сувязі з канцэптамі *Радзіма*, *мова*, *воля (свабода)*.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Бельскі, А.І. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А.І. Бельскі, Л.К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 320 с.

2. Лазарук, М.А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / М.А. Лазарук,Т.У. Логінава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 304 с.
3. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ-ра, 1987. – Т. 1 : Вершы, паэмы. – 431 с.
4. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ-ра, 1989. – Т. 4, кн. 1. : Каласы пад сярпом тваім. – 399 с.
5. Півавар, К.С. Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту / К.С. Півавар. – Віцебск : Віцеб. дзярж. ун-т, 2015. – 155 с.